УДК 070 (476)

# «НАША НІВА» І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

**Філякоў У. Г.**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
прафесар кафедры прафсаюзнай работы
і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»
г. Мінск

*Анатацыя:* У артыкуле разглядаецца роля газеты «Наша ніва» у абуджэнні і фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў у пачатку ХХ ст.
*Ключавыя словы:* гісторыя, культура, друк, нацыянальная самасвядомасць.

*Annotation:* The article analyzes the role of the newspaper «Nasha Niva» in awakening and shaping the national identity of Belarusians.
*Keywords:* history, culture, national identities.

Роля гэтага выдання і цесна звязанная з ім праблема нацыянальнага І культурнага развіцця Беларусі як адна з самых вострых у грамадска-палітычным жыцці пачатку XX ст. атрымала неадназначную інтэрпрытацыю навукоўцаў. У жорсткай палеміцы скрыжаваліся мячы абаронцаў і праціўнікаў права народа на вольнае развіцце. Даследчыкі гэтага пытання прыбягалі або да празмернай ідэалізацыі або да згушчэння фарбаў, а то і проста да замоўчвання асобных гістарычных фактаў. Вялікую шкоду прынесла і блытаніна ва ўжыванні тэрміна «нацыяналізм». Няправільна выкарыстаны і пушчаны ў абарот, ен на працягу дзесяцігоддзяў панаваў у грамадска-палітычнай думцы і выкарыстоўваўся часам у карыслівых антынавуковых мэтах.

Сення шырокай грамадскасцю прызнана роля «Нашай нівы» у нацыянальным адраджэнні Беларусі ў пачатку XX ст. Пра гэта сведчаць і матэрыялы вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, што ўбачылі свет апошнім часам. Іх аўтары даволі падрабязна асвятляюць мэты выдання, умовы дзейнасці, сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя погляды рэдакцыі. Важнае месца ў адпаведных раздзелах дапаможнікаў займаюць матэрыялы пра выдатную ролю газеты ў развіцці розных галін нацыянальнай культуры.

Уся дзейнасць «Нашай нівы» была накіравана на абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў. На жаль, у названых дапаможніках не паказаны пленныя вынікі дзейнасці газеты ў гэтым накірунку. А між тым

яны вельмі важныя для ўсведамлення студэнтамі важнай ролі нацыянальнай свядомасці ў нашым сучасным жыцці. Толькі чалавек з развітай нацыянальнай свядомасцю можа асабліва пленна працаваць для ўмацавання незалежнай маладой дзяржавы, гатовы вынесці часовыя цяжкасці на гэтым доўгім і цярністым шляху

Пытанне нацыянальнай самасвядомасці непарыўна звязана з развіццем нацыянальнай культуры. І гэта зразумела. Культура ўяўляе складаную, шматгаліновую сістэму, якая ахоплівае увесь духоўны свет народа, яго свядомасць. сукупнасць перакананняў, поглядаў. пачуццяў. Яна з аднаго боку, адлюстроўвае народ, яго характар, гісторыю, імкненні, а з другога – сама ўздзейнічае на народ, фарміруе яго, вучыць разумець самога сябе. Звяртаючыся да рэчаіснасці, часта апярэджваючы ў сваей інтуітыўнай форме разуменне свету, яго навуковае пазнанне, культура, аказвае велізрнае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнай свядомасці. Яна становіцца складовай часткай нацыянальна-вызваленчага і дэмакратычнага руху.

Вельмі важна звярнуць увагу на наступную акалічнасць. Пры адсутнасці ў беларусаў на працягу пэўнага часу сваей дзяржаўнасці, самастойных форм палітычнага і эканамічнага жыцця менавіта культура выступала як важнейшы аб'яднальны фактор, яна садзейнічала і забяспечвала захаванне этнічнай самабытнасці народа, вяла да абуджэння і выспявання нацыянальнай свядомасці. Культура прыняла на сябе нацыянальна-кансалідацыйныя і патрыятычныя функцыі. Яркі прыклад таму нацыянальна-культурнае адраджэнне Бацькаўшчыны ў пачатку XX ст.

Як вядома, вялікае значэнне для лесу беларускага народа і яго культуры мела рэвалюцыя 1905-1907 гг . З нагоды тых падзей Я. Купала пісаў: «Калі ў памятны 1905 год зрабілася завіруха, калі ў Расіі ў кожнага чалавека будзіцца душа да новага жыцця, да новага шчасця. – і у беларуса будзіцца стала пачуцце свайго «Я», стала гучаць доўга дрэмлючая думка, што і мы людзі» [1]. 1905 год з'явіўся па словах М. Багдановіча, вяхой, якая адзначала пункт пералому ў гісторыі беларускага адраджэння [2]. Новыя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці знайшлі свае яскравае адлюстраванне ва ўсіх галінах нацыянальнай культуры таго часу, абумовіўшы з'яўленне новых ідэй, тэм вобразаў. З гэтага часу беларуская культура пачынае выходзіць за вузкія этнаграфічныя межы, становіцца поруч з культурамі іншых народаў.

У сувязі з гэтым важна зразумець, што такое «нацыянальная свядомасць». На аснове сучасных даследванняў складваецца ўяўленне аб нацыянальнай свядомасці як аб складаным па сваей структуры духоўным утварэнні ў грамадскім жыцці Яна ўключае ў сябе пачуцці і думкі этнічнай прыналежнасці людзей, прыхільнасці іх да нацыянальных каштоўнасцяў мінулага і сучаснага, да культуры і мовы, любоў да Бацькаўшчыны. Фарміруючыся адначасова і разам з узнікненнем народаў у працэсе асэн-

савання рэальных умоў і абставін гістарычнай эпохі, нацыянальная самасвядомасць набывае значэнне важнага духоўнага фактара, што замацоўвае і развівае набыткі народа. З дапамогай «Нашай нівы» паспрабуем прасачыць працэс усведамлення сябе беларусамі нашых землякоў на пачатку ХХ ст.

Галоўнымі тэмамі газеты былі Беларусь і лес яе народа. У першым нумары абвяшчалася: «Мы будзем служыць усяму пакрыўджанаму беларускаму народу, пастараемся быць люстрам жыцця, каб ад нас як ад люстра, свет падаў у цемнасць. Мы будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць, хто яны есць – зразумелі, што яны беларусы і людзі каб пазналі свае правы...» [3].

Сацыяльнай базай «Нашай нівы», а таксама аб'ектам яе клопату быў працоўны народ, перш за ўсе сялянства. Пры аналізе большасці матэрыялаў газеты звяртае на сябе ўвагу іх форма і стыль, якія вынікалі з арыентацыі на сялян і абумоўліваліся наяўнасцю цэнзуры. Нельга не пагадзіцца з даследчыкамі «Нашай нівы», што некаторая зададзенная спрошчаннасць і народная вобразнасць пісьма, своеасаблівая інфармацыйнасць многіх артыкулаў, сведчылі аб разуменні супрацоўнікамі рэдакцыі асветніцкіх задач, аб іх высокім журналісцкім майстэрстве, аб здольнасці наладзіць шчыры дыялог з чытачамі. Сведчанне таму – сотні лістоў чытачоў з самых аддаленых куткоў Беларусі. «Яна, – адзначаў М. Багдановіч, – прабіла сабе дарогу ў самыя глухія куткі Беларусі, у самыя цемныя слаі насельніцтва. Для многіх тысяч людзей яна з'явілася першай газетай, прачытанай імі, першай крыніцай ведаў, якая не мела афіцыйнага адбітку і была выкладзена простай і яснай мовай. Да беларускага селяніна, які зжыўся з думкай, што ен – хам, а яго «мова» – хамская, «Наша ніва» друкаваным чынам звярнулася на гэтай «мове», выклікаючы у ім тым самым павагу і да яе і да самога сябе, абуджаючы у ім пачуцце ўласнай годнасці».

Як вядома, адной з галоўных тэм газеты была беларуская мова. Яна даказвала чытачам, што «мова наша – гэта скарб нашы багаты і пекны», які «дарагі нам за тое, што ен наш і родны». «Наша ніва» заклікала ўсіх свядомых беларусаў імкнуцца прасвяціць «людзей цемных або замучанных», шырыць паміж іх «любоў да роднай зямлі, Айчыны нашай; да мовы спрадвечнай нашай беларускай» [4]. Дзейнасць газеты ў гэтым накірунку прыносіла свае вынікі «Да гэтага часу (маецца на ўвазе выхад беларускіх газет – Ул. Ф.) я, як і іншыя, цураўся і пазбягаў роднае мовы, – згадваў Ц. Гартны. – Ва мне, як і ў шмат кім укаранілася думка, што беларуская мова – архаічная мова і раптам усе паняцці па гэтым пытанні пайшлі прахам. Газета на роднай мове! Як гэта па мастацку і усе зразумела! І я ўсею душою гарнуўся да роднае мовы.»

Фарміраванне нацыянальнай свядомасці павінна было ажыццявіцца на аснове аналіза гістарычнага мінулага, гісторыка-культурнай спадчыны, нацыянальных традыцый, міжнацыянальных адносін сацыяльна-эканамічных працэсаў. Гэта добра разумелі дзеячы нашай культуры.

Яны разглядалі народную культуру як носьбіт этнічнай, у тым ліку моўнай, сваеасаблівасці народа. Ва ўмовах Беларусі да рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. яна з’ўлялася важнейшай калі не адзінай сферай самастойнага грамадскага жыцця. Менавіта праз фальклор, у якім шлі жывыя творчыя працэсы, беларусы выявілі сваю прысутнасць у еўрапейскай культуры. А народная гаворка з’явілася асноўнай крыніцай фарміравання літаратурнай мовы. На фальклорнай аснове ствараліся найбольш значныя творы ў айчыннай літаратуры і мастацтве.

Важкі ўклад у вывучэнне народнай спадчыны зрабілі такая выдатныя даследчыкі як Е. Раманаў, Я. Карскі, М.Нікіфароўскі, М. Доўнар-Запольскі і іншыя. Яны разглядалі фальклорны матэрыял як крыніцу ведаў пра мінулае Бацькаўшчыны і як крыніцу моўную. Даследванні беларускіх навукоўцаў, дапамагалі вярнуць народу забытыя імены славутых продкаў, пазнаеміць з гістарычнымі старонкамі жьщця старажытнай Беларусі. Вялікая ўвага была звернута на гісторыю нашай краіны.

«Гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыцце народа, – адзначаў ў прадмове да сваей «Кароткай гісторыі Беларусі» (1910 г.) В. Ластоўскі. I нам, каб адбудаваць свае жыцце трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быу моцны. А фундамент у нас важны, гісторыя наша багата...» [5]. Пленна працавалі над вывучэнням гісторыі нашага народа М. Багдановіч, С.Палуян, А. Луцкевіч. Зварот да айчынных традыцый, адкрыцце старажытных вытокаў свайго народа, яго культуры надавалі нацыянальнай свядомасці гістарычную глыбіню. Гэтыя даследванні, што з’яўляліся на старонках «Нашай нівы», можна разглядаць як люстэрка, у якім беларусы маглі ўбачыць сябе і якая паглыблялі іх свядомасць.

Лісты чытачоў, артыкулы «Нашай нівы» поруч з даследваннямі этнографаў канца XIX – пачатку XX ст. дазваляюць прасачыць за працэсам росту нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, глыбей зразумець асаблівасці нацыянальнага характару.

«Усе каму дарага і блізка справа жыцця і адраджэння Беларусі і беларусаў выпісвайце, чытайце і шырце беларускую газету «Наша ніва». Гэта душа думак і патрэб Беларусі». Такую рэкламную аб'яву можна было сустрэць па старонках беларускіх і украінскіх выданняў. I сябры газеты, шчырыя прыхільнікі Беларусі шырылі яе. Тыраж у 4,5 тыс. экзэмпляраў разыходзіўся поўнасцю. Беларускую газету чыталі не толькі на Беларусі, але і ў Пецярбургу, Маскве, Пскове, Ноўгарадзе, Сочы, Ялце, Севастопалі, Кіеве, Харкаве, Екацерынаславе (Дняпры), Адэсе, Львове, Рызе, Рэвелі (Таліне), Юр’еве (Тарту), Варшаве, Лодзі. «Наша ніва» мела падпісчыкаў у гарадах Паволжа, Уралу, Сібіры, Паўночнага Каўказа. Газета расылалася чытачам у Празе, Парыжы, Лондане, Нью-Ёрку, на франтах Першай сусветнай вайны.

Падпісчыкамі за межамі Беларусі былі яе сыны і дочкі, якіх лес раскідаў па розных кутках Расійскай імперыі і за яе межамі. Для іх газета была жывой нітачкай, якая злучала з далекай Бацькаўшчынай. «Хоць мы і далека ад сваей роднай старонкі, але газету «Наша ніва» чытаем, вельмі рады, як пачуем свае роднае слова і тую мову, у каторай узгадаваліся» – шсала трупа беларусаў. што працавала на адной з шахт Данбаса. Я. Журба з Украіны ў сваім лісце ў рэдакцыю прызнаваўся: «Вялізнай уцехай бываюць, тыя хвіліны, калі я чытаю родную газэціну – мыслямі перанясешся ў мужыцкія вескі, у бедныя галодныя хаты, устае і праходзіць прад маімі вачыма ўсе блізкае, усе роднае.» «Сыны Белай Русі» так падпісалі свой допіс у «Нашу ніву» студэнты настаўніцкага інстытута з Феадосіі (Крым). У ім маладыя беларусы адзначалі: «Што б не казалі проці вас ворагі беларускага слова, верце і ведайце, што ўсе тыя, што любяць народ, лічаць вашу працу – святой працай, бо слова ўсякай рэчы. пачутае беларусам у сваей роднай мове, куды больш зразумело і бліжэй. чым сказанае ў мове чужой, слова роднае чутно не толькі розумам чалавека, але і сэрцам... Працуйце ж у роднай мове на доўгія гады!» [6]

Усе гэтыя лісты сведчылі пра любоў беларусаў да Бацькаўшчыны, да газеты на роднай мове. Яны і многія публікацыі «Нашай нівы» паказвалі сапраўды глыбокую сувязь выдання з жыццем, інтарэсамі і імкненнямі беларускага народа.

Многія з нашых землякоў, што жылі далека ад Беларусі, а на пачатку XX ст. іх было шмат дзесяткаў тысяч, не парывалі сувязей с Бацькаўшчынай, не забывалі сваей нацыянальнай прыналежнасці Раскіданыя на неабсяжных абшарах Расійскай імперыі, яны імкнуліся захаваць на чужыне адзінства – як хвалюючы ўспамін, як натхняючую надзею. Для гэтага яны стваралі свае арганізацыі, дабрачынныя таварыствы. Адной з форм дзейнасці такіх таварыстваў былі харавыя спевы і арганізацыя літаратурна-музычных вечарын на роднай мове. Цяга да беларускай мовы, літаратуры і мастацтва служыла магутным фактарам развіцця самасвядомасці народа.

Студэнты-беларусы, што навучаліся ў вышэйшых навучальных установах Расіі, аб’ядноўваліся ў зямляцтвы. Апошнія адыгралі станоўчую ролю ў вывучэнні роднага краю і папулярызацыі ведаў аб яго прыродзе. гісторыі. насельніцтве, культуры. Цікавыя звесткі аб дзейнасці беларускіх суполак у Пецярбургу сустракаюцца на старонках «Нашай нівы».

У сталіцы Расіі існавалі гродзенскае, магілеўскае, віцебскае, бабруйскае і іншыя зямляцтвы. З 1910 г. яны пачалі наладжваць «беларускія вечарынкі. Аб адной з іх усхвалявана расказала чытачам газеты Цетка (Э. Пашкевіч): «Вось у Пецярбургу закінутыя далека ад роднай старонкі беларусы не мелі нават апраткі сваей. Дык кожны нес, што меў на першае беларускае ігрышча – хто паясок з Магілеўшчыны, хто світку з Віцебшчыны, хто сарочку з Гродзеншчыны – і гэтак прыадзеліся. І дзіўна было,

і радасна, што блізка з кожнага куточка Беларусь прыслала свайго сына з дарам...» [7].

Найбольш вядомай і пленнай была дзейнасць гуртка Пецярбургскага універсітэта. Яго драматычнай трупай кіраваў Б. Эпімах-Шыпіла. За некалькі гадоў яго стараннямі студэнты падрыхтавалі некалькі спектакляў, у т. л. славутую «Паўлінку» Я.Купалы, які падтрымліваў цесныя сувязі з пецярбургскімі беларусамі. Падобных прыкладаў было нямала.

У выніку актыўнай. самаадданай дзейнасці беларускіх пісьменнікаў, настаўнікаў, «Нашай нівы» нацыянальная самасвядомасць, перш за ўсе ўсведамленне сваей нацыянальнай прыналежнасці, ахоплівала пэўныя слаі насельніцтва. Так, у кастрычніку 1913 г. рабочыя-беларусы Капыля звярнуліся ў Дзяржаўную Думу з петыцыяй, у якой патрабавалі прызнаць родную мову і падтрымаць прашэнне аб адкрыцці на Беларусі універсітэта [8].

Адзначаючы вялікі ўклад «Нашай нівы» у абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў, трэба абавязкова падкрэсліць, што яна выступала за дружбу і згуртаванасць усіх народаў Беларусі. «Мы беларусы – падкрэслівалася ў адным з артыкулаў, – павінны дакладна прытрымлівацца простай і высокай мэты адраджэння нашага краю, цверда і з гонарам адстойваць свае людскія, грамадскія правы, абараняючы правы ўсіх нацый нашага краю ідучы разам з прагрэсіўнымі людзьмі братніх нам народаў Расіі. Мы павінны глядзець на 10 – 30 год уперад у сваю вялікую будучыню, якая будзе такая, як і будучыня нашых суседзяў» [9].

Газета «Наша ніва» адыграла важную ролю у лесе беларускага народа на пачатку XX ст. Яна з’явілася сваеасаблівай трыбунай, хай сабе і невялічкай, але рэха таго, што з яе прамаўлялася, каціласяпа Беларусі абуджаючы народ. З гэтага часу, калі пачынаючы з «Нашай долі» і «Нашай нівы» пайшлі ў свет беларускія газета, часопіс, кніга, нацыянальна-вызваленчы рух стаў грамадскай падзеяй і рэальнай сілай, з якой не маглі не лічыцца не толью прыхільнікі, але і ворагі. Сапраўды. зробленае нашымі пісьменнікамі, навукоўцамі, мастакамі артыстамі для ўздыму культуры ўспрымаецца з вышыні сенняшняга дня са здзіўленнем і захапленнем, як сапраўдны цуд. Пачуцце гонару выказвалі і сучаснікі. Я. Купала, у прыватнасці адзначаў: «Калі зірнем мы на тое, што за некалькі год зроблена намі беларусамі над падняццем свайго наыянальнага багацця, то адно толькі – душа можа радавацца. Выходіць, у свет колькі беларускіх газет, друкуюцца кожны год дзесяткі кніжак розных названняў, закладваюцца беларускія выдавецкія суполкі, кнігарні. І ўсе гэта робіць сам народ ці сваей шчырай працай для Бацькаўшчыны, ці сваімі запрацаванымі капейкамі аддаванымі на беларускія газеты і кніжкі. Мы не маем ні казенных падачак, ні купленых працаўнікоў. Працуем для ідэі.» І сапраўды. Нацыянальная ідэя напаўняла ўсю культурна-асветніцкую

дзейнасць дзеячоў культуры. Пасля рэвалюцыі 1905 – 1905 гг., дзякуючы іх намаганням з'явіўся прафесійны беларускі тэатр – славутая трупа І. Буйніцкага, якой апладзіравалі гледачы не толькі гарадоў і весак Беларусі, але і Варшавы, Пецярбурга. Вялікіх поспехаў дасягнуў і беларускамоўны друк. За дзесяць гадоў было выдадзена каля 80 кніг накладам амаль 230 тыс. экземпляраў. Выдатную ролю ў грамадскім і культурным жыцці Беларусі на пачатку XX ст. адыграла газета «Наша ніва», якая стала цэнтрам згуртавання свядомых беларускіх сіл.

Уся дзейнасць гэтага выдання была прасякнута высокім патрыятызмам, садзейнічала нацянальнаму і палітычнаму абуджэнню беларускага народа, яго згуртаванню, аказала пэўны ўплыў на духоўнае аблічча нацыі.Дзякуючы «Нашай ніве», дзеячы культуры выконавалі ролю сваеасаблівага генератара і трасфарматара новых ідэй, форм і метадаў культурнай дзейнасці Іх пленная дзейнасць пераканаўча сведчыла, што у масавай свядомасці, па словах М. Багдановіча, усе глыбей укаранялася ідэя, што «беларускі народ не tabula rasa (чысты аркуш - лац.). а самастойная нацыянальная велічыня, беларускі ж рух – жывая культурна-грамадская сіла.» [10].

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Наша ніва. – 1913. – № 30.

2. Багдановіч, М. Збор твораў : у 2 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і техніка, 1968. – Т. 1. – С. 231.

3. Наша ніва. – 1906. – № 1.

4. Наша ніва. – 1909. – № 39 ; Гарун, А. Матчын дар. Думы і песні / А. Гарун. – Мінск : Мастацк. літ-ра, 1988.

5. Власт. Кароткая гісторыя Беларусі / Власт. – Вільна, 1910. Прадмова.

6. Філякоў, У. Беларуская газета «Наша ніва» / У. Філякоў / Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск : 1997. – С.137.

7. Філякоў, У. Беларуская газета «Наша ніва» / Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – 1997. – С.132.

8. Наша ніва. – 1908. – № 14.

9. Наша ніва. – 1912. – № 14.

10. Багдановіч, М. Збор твораў : у 2 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і техніка, 1968. – Т. 2. – С. 103.